# РАЗВІЦЦЁ ТЭЛЕТЭАТРА НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ І ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАГА МАСТАЦКАГА ТЭЛЕВЯШЧАННЯ КРАІНЫ

**Трапянок У. А.**
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*

***Анатацыя.*** *Аўтарам артыкула разглядаецца пытанне развіцця тэлетэатра ў Беларусі. Адзначаецца, что ў 1991 г. пачаўся пераход да «камерцыялізацыі» вяшчання, літаратурна-мастацкія перадачы пачалі выцясняцца ток-шоу і кінафільмамі. Для павышэння якасці і канкурэнтназдольнасці сучаснага тэлебачання неабходны новыя формы звароту да мастацкага вяшчання, узаемадзеянне з замежнымі рэдакцыямі, а таксама зварот да класічнай мадэлі функцыянавання СМІ (інфармаваць – выхоўваць – забаўляць), у якой пазіцыя «выхоўваць» стаіць перад пазіцыяй «забаўляць».*

***Summary.*** *The author of the article discusses the development of teleteatra in Belarus. It is noted that in 1991 began the transition to the «commercialization» of broadcasting, literary transmission began to be superseded talk shows and movies. To improve the quality and competitiveness of modern television requires new forms of treatment to the art broadcasting, interaction with foreign editorial offices, as well as an appeal to the classical model of the functioning of the media (inform – educate – entertaining), in which the position is to «educate» stands in front of the position of «entertain».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да 1991 г. Беларускае тэлебачанне, нягледзячы на развіццё ў сістэме ўсесаюзнай тэлевяшчальнай сеткі,ператварылася ў самастойную вытворча-творчую арганізацыю, якая выпускала тэлепрадукт розных жанраў, разлічаны на аўдыторыю любых узростаў. У перабудовачны час, калі змены адбыліся ва ўсіх сферах краіны, у тым ліку, на Беларускім тэлебачанні (а яно пачало развівацца як самастойная структура), айчынны тэлетэатр працягнуў існаванне ў паменшаных аб'ёмах у параўнанні з ранейшымі гадамі. На тэлебачанні ў якасці рэжысёраў працягвалі працаваць мэтры тэлетэатра В. Карпілаў, У. Траццякоў, а таксама В. Жыгалка, У. Бокун, У. Колас і інш. У 1992 г. быў зняты тэлефільм-спектакль «Тутэйшыя» да 110-й гадавіны з дня нараджэння Я. Купалы паводле пастаноўкі М. Пінігіна, рэжысёрам тэлеверсіі выступіў В. Шавялевіч [1, с. 117]. Тэатральны спектакль зафіксаваны на плёнку і перанесены ў тэлевізійную рэальнасць, галоўную ролю Мікіты Зносака выканаў артыст В. Манаеў. У 1992 г. беларускі тэлетэатр звярнуўся да яшчэ аднаго класіка айчыннай літаратуры У. Караткевіча і ўвасобіў на экране яго твор «Калыска чатырох чараўніц», сцэнарый і пастаноўку ажыццявіла рэжысёр Л. Тарасава. Рэжысёр В. Басаў у 1992 г. стварыў спектакль «Крыж на зямлі і поўня ў небе».

За апошняе дзесяцігоддзе XX ст. на Беларускім тэлебачанні з'явіліся пераважна тэлефільмы паводле вершаванай спадчыны («Анталогія беларускай паэзіі»), адзінкавыя спектаклі «Чорны квадрат», «У чаканні», «Апошняя роля», «Пракляты ўтульны дом», «Спартак». Відэфільмы-спектаклі выпускаліся таксама ВТА «Беларускі відэацэнтр»: з 1989 да 1999 года з'явілася сем работ па творах беларускіх і замежных аўтараў [7].

У пачатку 2000-х гг. адбыліся чарговыя змены ў палітыцы тэлевяшчання Беларусі. У маі 2000 г. галоўны дзяржаўны канал змяніў сваю назву на «Першы нацыянальны тэлеканал». Да канца года ўсе рэдакцыі былі скарочаны, з'явіліся тры новыя – грамадска-палітычнага, мастацкага і спартыўнага вяшчання. Але на

практыцы абнаўленне тычылася перш за ўсё забаўляльных і крымінальных праграм [5, с. 68]. Тэлевізійны тэатр адыходзіў, саступаў месца іншым перадачам і кінамастацтву.

У 2001 г. у Беларусі пачаў вяшчанне тэлеканал «СТБ» («Сталічнае тэлебачанне»). Яго праграма пабудавана на пакеце перадач расійскага тэлеканала «РенТВ». У 2002 г. на базе расійскага тэлеканала «ОРТ» у нашай краіне адкрыўся яшчэ адзін канал АНТ («Агульнанацыянальнае тэлебачанне»). Пераход на легітымныя дамовы з расійскімі тэлекампаніямі не паспрыяў з'яўленню ў супольнай тэлесетцы грамадскіх каналаў сучасных узораў тэлетэатра ці фондавых тэатральных пастановак з замежных рэдакцый. Адзіным плюсам можа лічыцца рэтрансляцыя на тэрыторыі Беларусі расійскага спецыялізаванага тэлеканала «Культура», у эфіры якога зрэдку транслююцца спектаклі, запісаныя ў тэатрах ці ўзятыя з нацыянальных фондаў.

Галоўны медыяхолдынг краіны Белтэлерадыёкампанія, у складзе якой на сёння шэсць уласных тэлеканалаў і сёмы рэтрансляцыйны («НТВ-Беларусь»), працуе па прынцыпе размеркавання вытворча-вяшчальных і творчых рэсурсаў. Адбылася спецыялізацыя каналаў. Асвятленне дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў галіне культурнага жыцця краіны забяспечвае сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3», вяшчанне якога пачалося ў 2013 г.

У эфірным раскладзе «Беларусь 3» маюцца фільмы-партрэты, прысвечаныя жыццю і творчасці акцёраў, рэжысёраў, мастакоў, сцэнографаў. Гэта работы, якія захоўваюцца ў тэле- і кінафондах Беларусі. У першы год вяшчання сваю нішу ў праграме занялі тэлеспектаклі, знятыя ў студыі ці запісаныя ў тэатральнай зале. У першыя месяцы, калі тэлеканал працаваў у тэставым рэжыме, спектаклі з фондаў БТ ішлі не ў самы зручны час – у працоўныя дні раніцай ці ўдзень. Гэта пазбаўляла працоўных людзей ці моладзь, якая вучыцца, магчымасці спрычыніцца да традыцый мастацкага тэлевяшчання, не спрыяла папулярызацыі драматычнага тэатра ў цэлым. Затым тэледрама была перанесена на нядзельны вечар у рубрыку «Тэатр. Выбранае» [6]. Аднак эксперыменты з «пошукамі» найбольш зручнага эфірнага часу для тэатра па-ранейшаму працягваюцца. Зараз у вячэрні час на тэлеканале транслююцца кінафільмы, творы тэлетэатра зрэдку выходзяць у дзённы час выхадных дзён. Гэта пераважна работы з фондаў Беларускага тэлебачання, знятыя ў розныя гады. Маюцца адносна новыя запісы. Сярод іх, напрыклад, спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл» (2012 г.), «Translations» і «Сымон-музыка» (2015 г.), пастаноўка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Адвечная песня» (2015 г.). У XXI ст. не створана ніводнага арыгінальнага тэлеспектакля. Паводле вынікаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі 2016 г. спецыяльнага дыплома Белтэлерадыёкампаніі ўдастоены спектакль «Пінская шляхта» Палескага драматычнага тэатра (рэжысёр В. Баркоўскі). У якасці прыза стала падрыхтоўка тэлеверсіі пастаноўкі, якая выйшла ў эфір 27 сакавіка 2017 г. Такім чынам, на сучасным этапе тэлевізійны тэатр Беларусі развіваецца аднабакова – рэпрадукцыйна (рэтрансляцыйна).

На спецыялізаваным канале «Беларусь 3» у 2016 г. з'явілася праграма «Тэатр у дэталях», у якой гаворка вядзецца пра рэпертуарныя тэатры, ладзяцца кароткія сустрэчы са стваральнікамі пастановак. Але ў тэлеэфіры цалкам адсутнічаюць перадачы з аналізам тэатральнага жыцця краіны. Раней на тэлеканале «СТБ» выходзілі перадачы на тэмы культуры і мастацтва «Тэатральны раз'езд» і «Арт-экспрэс». На тэлеканале «Лад», на аснове якога створаны тэлеканал «Беларусь



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2», існавала праграма «Інстытут культуры». Знаёмства з тэатральнымі прэм’ерамі краіны ідзе інфармацыйна, па факце з’яўлення той ці іншай тэатральнай работы.

У раскладзе абласных тэлерадыёкампаній тэатральныя работы адсутнічаюць. Адметна, што ў 1961 г. арыгінальныя тэлеспектаклі ствараліся на Гомельскай і Віцебскай студыях, у 1971 г. на Брэсцкім абласным ТБ [7, с. 454].

На сучасным этапе тэлевяшчання Беларусі існуе праблема «экалогіі мастацкага тэлевяшчання», калі з эфірнай сеткі практычна зніклі творы высокай якасці, а тэлебачанне прапануе нізкапробныя серыялы і перадачы забаўляльнага характару, здольныя павесяліць гледача, а не ўзвысіць яго ці пазнаёміць з сусветнымі культурнымі здабыткамі. Пастаянна ўзмацняецца спажывецкі фактар, тэлебачанне ідзе за густамі гледачоў, а не вядзе аўдыторыю за сабой, як гэта было ў савецкі час. І гэта праблема не толькі беларускага тэлебачання. Даследчык С. Ільчанка пісаў, што на сучасным этапе адбыўся пераход ад спектакля да шоу-цывілізацыі [2]. Але ці можна параўнаць сённяшнія шоу-праграмы з тэлевізійнымі спектаклямі? Паводле класіфікацыі А. Кузьміновай, тэлешоу падзяляюцца на 4 групы: 1 – рэаліці-шоу (жанр паказу рэальнага жыцця ўдзельнікаў праграмы ў адпаведнасці з умовамі прапанаванай гульні); 2 – ток-шоу (жанр, у якім вербальны элемент больш важны, чым візуальны); 3 – вэраеці шоу (тэлешоу, складзенае з шэрагу камічных сцэнак, песень, танцаў і іншага: музычныя шоу, гумарыстычныя праграмы, стэнд-ап камедзі, скетч-шоу; 4 – шоу-гульні (тэлевіктарыны, гульні-спаборніцтвы і інш.) [3, с. 15]. На нашу думку, ніводная з груп цалкам не стасуецца з тэлевізійнымі спектаклямі, паколькі прадукцыя падобных праграм не падпарадкоўваецца правілам стварэння мастацкага вяшчання, не ўлічваюцца драматургічныя, пастановачныя і выканальніцкія законы, характэрныя для мастацкага вяшчання. Функцыянальнае прызначэнне шоу (забава, распальванне нянавісці, запалохванне, навязванне «нізкіх» каштоўнасцей і інш.) не стасуецца з мастацкімі вартасцямі тэлеспектакляў, якія будаваліся на прынцыпах духоўнасці, маралі. Тэмы ток-шоу актуальныя, набліжаныя да рэальнага жыцця і простага чалавека, але тэлешоу – гэта масавая забаўляльная праграма, у іх адсутнічае тэатральная эстэтыка. Тэлетэатр – гэта мастацкае адлюстраванне рэчаіснасці. Мастацтва спрабуе знайсці прычыны пэўных канфліктаў, яно узвышае чалавека, прымушае задумацца. Тэлевізійныя шоу найчасцей ператвараюцца ў гвалт, дзе пытанні абмяркоўваюцца павярхоўна, з тэлеэкрана пераважна ідзе «зашкал» эмоцый, а не мастацкае асэнсаванне рэчаіснасці ці якой-небудзь праблемы. Мела рацыю В.Ф. Нячай, калі пісала, што ў прасторы мас-медыя, якая прапанавала аўдыторыі вялікую колькасць культурных «тэкстаў», суіснуюць антыкаштоўнасці і антыкультура. Адмаўленне маральных каштоўнасцей прыводзіць да знішчэння самога паняцця «мастацкая каштоўнасць» [4, с. 23]. Адсюль вынікае, што калі сучаснае беларускае тэлебачанне не павернецца да мастацкіх вяшчальных традыцый, з якіх усё пачыналася, з часам яно можа ператварыцца ў нізкапробны, неканкурэнтназдольны сродак масавай камунікацыі, які негатыўна паўплывае на духоўнае развіццё нацыі, што, у сваю чаргу, адаб’ецца на сацыяльна-эканамічным становішчы краіны.

Такім чынам, у 1991 г. пачаўся пераход да «камерцыялізацыі» вяшчання, літаратурна-мастацкія перадачы пачалі выцясняцца ток-шоу і кінафільмамі. Прадукцыйная функцыя тэлетэатра ў XXI ст. не выкарыстоўваецца. Папаўненне мастацкай тэлевізійнай з’явы адбываецца за кошт нячастых здымак тэатральных работ з далейшай іх трансляцыяй на канале «Беларусь 3». Для павышэння якасці і канкурэнтназдольнасці сучаснага тэлебачання краіны неабходна шукаць новыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы звароту да мастацкага вяшчання, узаемадзейнічаць з замежнымі рэдакцыямі праз удзел у мастацкіх конкурсах, фестывалях і г.д., а таксама вярнуцца да класічнай трохприступкавай мадэлі функцыянавання СМІ (інфармаваць – выхоўваць – забаўляць), у якой пазіцыя «выхоўваць» стаіць перад пазіцыяй «забаўляць».


1. Беларусы. Т. 12. Экраннае мастацтва / А. В. Красінскі [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Красінскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.
2. Ильченко, С. Н. Эволюция системы жанров отечественного телевидения и ее трансформация в условиях глобализации информационного пространства / С. Н. Ильченко / Автореф. дис. … д-ра филологич. наук, спец. 10.01.10 – журналистика, Санкт-Петербург, лаборат. операт. печати фак-та жур-ки СПб. гос. ун-та, 2011. – 47 с.
3. Кузьмінова, А. Ю. Тэлешоу, ад творчай задумы да рэалізацыі / Ю. А. Кузьмінова ; навук. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : Медысонт, 2014. – 112 с.
4. Нечай, О. Ф. Экранная культура – трансляция и создание художественных ценностей / О. Ф. Нечай // Экран и культура (Белорусское документальное кино и культура Беларуси) : сб. мат. науч.-практ. конф. (Минск, 27-30 сент. 1999 г.) / Бел. Союз кинематографистов; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Нац. академия наук Беларуси ; отв. ред. О. Ф. Нечай – Минск : ЗАО «ТЭКСАРТ». – С. 22–32.
5. Плавник, А. А. Основные этапы развития аудиовизуальных СМИ : учеб.-метод. комплекс для студ. фак. журналистики / А. А. Плавник. – Минск : БГУ, 2003. – 104 с.
6. Трапянок, У. А. Перыяды станаўлення і развіцця тэлетэатра Беларусі: ад першых дзён – да нашага часу / У. А. Трапянок // Культура : открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / сост.: Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко ; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Бел. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2013 – С. 264–268.
7. Фральцова, Н. Ц. Тэлевізійны тэатр / Н.Ц. Фральцова // Тэатральная Беларусь : Энцыклапедыя : У 2 т. Т. 2: Лабанок – Яшчур / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 454–457.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВОБРАЗЫ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ ВА ЎСХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІМ І БЕЛАРУСКІМ МУЗЫЧНЫМ МАСТАЦТВЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ ХХ СТ.


**Трафімчук Т. Ю.**

*кандыдат мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры гукарэжысуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (г. Мінск)*



***Аннотация.*** *Внимание к образам эпохи Средневековья занимает важное место в художественной культуре второй половины XX в. Многие композиторы различных национальных школ также обращаются к духовным ценностям и художественным артефактам прошлого в своем творчестве. Различное по своей природе, оно не только концептуально объединяет определенную группу произведений авторов разных поколений и школ, но и представляет важнейшие универсальные духовные ценности культуры XX в.*

***Summary.*** *The attention to the sphere of the Middle Ages occupy an important place in the art culture and of the 20$^{th}$ century. Many composers of different national schools have turned to spiritual values and artistic artifacts of the past in its creativity. Different nature, it do not only conceptually combine a certain group of works by authors from different generations and schools, but also represent the important universal spiritual values in the culture of the 20$^{th}$ century.*